Женский подвиг в истории Беларуси. 1917–2017 годы [Электронный ресурс] : электронный сборник материалов Международной научно-практической конференции, 26 октября 2017 г., Витебск. – Режим доступа: http://vlib.by/index.php/ru/zhenskij-podvig

Субоцін А.А. *(г. Віцебск)*

УДЗЕЛ ЖАНЧЫН У СТАХАНАЎСКІМ РУХУ Ў СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ БССР (1935–1941 гг.)

У гуманітарных навуках на сучасным этапе ўзрасла цікавасць да вывучэння праблем сацыяльнага, эканамічнага і палітычнага становішча жанчын. Такая тэндэнцыя звязана сёння з павышэннем іх ролі ў розных сферах жыцця грамадства, а таксама з актывізацыяй жаночых і фемінісцкіх рухаў. Для ўсебаковага даследавання гендэрных праблем важным з'яўляецца аналіз асаблівасцяў становішча жанчын у савецкі перыяд, калі адбылося шырокае ўключэнне прадстаўніц жаночага полу ў грамадскую вытворчасць і назіраліся некаторыя змены ў іх сацыяльным статусе. Асаблівы ўплыў на дадзеныя працэсы аказаў стаханаўскі рух, які разгарнуўся ў 1935 г. і суправаджаўся значнай актывізацыяй працоўнай дзейнасці жанчын. Да сённяшняга часу гісторыкамі не было вылучана ў якасці асобнага пытанне ўдзелу жанчын Беларусі ў стаханаўскім руху ў галінах яе эканомікі і не да канца былі раскрыты механізмы сацыяльнай мабільнасці стаханавак.

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца вызначэнне асаблівасцяў удзелу жанчын БССР у стаханаўскім руху ў сельскай гаспадарцы ў 1935–1941 гг.

Сельская гаспадарка БССР была ў другой палове 1930-х гг. ключавым сектарам эканомікі, дзе ў параўнанні з прамысловасцю абсалютную большасць удзельнікаў стаханаўскага руху складалі менавіта жанчыны. Па-першае, гэта абумоўлівалася самім гендэрным складам вёскі, дзе жаночая частка насельніцтва была большай па колькасці ў параўнанні з мужчынскай. Напрыклад, згодна даным Усесаюзнага перапісу насельніцтва 1937 г., у сельскай мясцовасці БССР пражывала 1926747 мужчын і 2183239 жанчын [2, с. 57]. Па-другое, у сельскай гаспадарцы, нягледзячы на механізацыю вытворчасці, усё ж пераважалі працэсы з выкарыстаннем ручной працы, на якія ў асноўным і прыцягваліся жанчыны і праяўлялі сябе тут у далейшым як удзельнікі стаханаўскага руху. Напрыклад, у шэрагу стаханаўцаў сельскай гаспадаркі Полацкай акругі ў канцы 1935 г. жанчыны складалі 52 % [3, арк. 389–391]. У пераліку 14 імён лепшых

стаханаўцаў мяса-малочных саўгасаў за 1936 г. СНК БССР было вылучана 10 жанчын-перадавікоў [5, с. 107–110].

Жанчыны, занятыя ў сельскагаспадарчай вытворчасці БССР, актыўна ўключыліся ў стаханаўскі рух у малочнай жывёлагадоўлі і свінагадоўлі. Так у 1936 г. лепшай калгасніцай-стаханаўкай па Полацкім раёне была прызнана свінарка А. Гендзелева, што дасягнула якасных паказчыкаў у сваёй працы пры гадаванні парасят, па Асвейскім раёне – даярка Ю. Івашкевіч (дабілася сярэднегадавога надою на адну карову ў 2700 літраў малака), па Дрысенскаму раёну – даяркі А. Вахцёрава (1244 літра малака) і П. Цяста (1150 літраў малака), па Ветрынскім раёне – даярка В. Ціханоўская (1800 літраў малака) [3, арк. 264–265]. Сярод работніц саўгасаў рэспублікі выдатна праявіла сябе даярка Е. Башкірава, якая дасягнула рэкордных удояў у 4–5 тысяч літраў малака на адну карову за год [5, с. 107]. У пералічаных галінах сельскай гаспадаркі ў другой палове 1930-х гг. практычна не выкарыстоўвалася тэхніка, і жанчыны дасягалі тут адзначаных высокіх паказчыкаў у працы за кошт выдатнага догляду за жывёламі і ўсталявання сістэмы іх якаснага кармлення.

Значную колькасць сярод стаханаўцаў жанчыны складалі ў такой вядучай галіне сельскай гаспадаркі БССР, як ільнаводства, дзе у працэсе развіцця стаханаўскай кампаніі сялянкі ўдзельнічалі ў руху тысячніц, мэтай якога было дасягненне ўраджайнасці льновалакна да 1000 кг з га. У 1936 г. у Дрысенскім раёне вылучыліся стаханаўкі А. Грыгуць і В. Валенцік, звенні якіх амаль дасягнулі такой мэты і сабралі адпаведна па 9,24 і 8,94 ц ільновалакна з га [3, арк. 160]. Ураджай каля 10 ц з га ў 1937 г. у Чаўскім раёне сабралі стаханаўскія звенні В. Дзюбаковай, М. Маханенкавай, К. Лазарэнка і В. Сапраненкавай [10, с. 41].

Жанчыны як стаханаўкі акрамя таго актыўна праявілі сябе ў апрацоўцы льновалакна. ЦВК і СНК БССР у снежні 1935 г. выдалі нават асобную Пастанову «Аб узнагароджанні граматамі і падарункамі лепшых калгасніц-ільнотрапальшчыц», згодна з якой было прэміравана 43 жанчыны-перадавіка [1, с. 1]. На працэсе льноапрацоўкі былі задзейнічаны самыя знакамітыя жанчыны-

стаханаўкі Беларусі. Рэспубліканскую і саюзную вядомасць атрымалі льнотрапальшчыцы П. Пярцова, М. Дзяжурная і С. Быкоўская, якія апрацоўвалі за дзень па 50–60 кг ільновалакна пры агульнапрынятай норме ў 10–12 кг. М. Дзяжурная, напрыклад, увогуле паставіла рэспубліканскі рэкорд і натрапала за дзень 66 кг 600 г лёну [6, с. 4].

Выдатныя працоўныя вынікі стаханавак па зборы і апрацоўцы ільновалакна дасягаліся за кошт якаснага выканання агранамічных патрабаванняў і перараз меркавання дапаможных аперацый на іншых сялянак. У некаторых выпадках такія аперацыі выконвалі блізкія сваякі стаханавак. Напрыклад, стаханаўка П. Пярцова толькі трапала лён, а дапаможныя працэсы па яго пераносу і ачыстцы выковала яе дачка [6, с. 4]. Такія выпадкі былі абумоўлены самой спецыфікай арганізацыі працы на вёсцы, калі ў склад паляводчага звяна часта ўваходзілі прадстаўнікі аднаго сялянскага двара ці сям'і.

Такім чынам, у працэсе мадэрнізацыі савецкага грамадства пачынаецца паступовае сціранне межаў традыцыйнага гендэрнага падзелу працы і засваенне жанчынамі характэрных для мужчын мадэляў сацыяльных паводзін, што прадугледжвалі не толькі ўключэнне ў грамадскую вытворчасць, але і пастаяннае ўдасканаленне метадаў працы, дасягненне яе высокай прадукцыйнасці, удзел у сацыялістычным спаборніцтве.

Пад уздзеяннем працэсу развіцця стаханаўскага руху адбываліся значныя змены ў сацыяльным становічшы тых жанчын, якія прымалі ў ім актыўны ўдзел. Гэтыя жанчыны, стаўшы стаханаўкамі, уваходзілі ў элітную катэгорыю працоўных, а іх гендэрны статус быў адзначаны новымі сацыяльнымі ралямі герояў вытворчай сферы, якія былі замацаваны да гэтага пераважна за мужчынамі. Менавіта ў ходзе стаханаўскай кампаніі многія жанчыны і атрымалі магчымасць стаць па выніках сваёй выдатнай працы знакамітымі гераінямі. Так, дзякуючы прапагадзе сацыялістычнага спаборніцтва праз публікацыі ў газетах, выданне папулярных брашур, арганізацыю злётаў перадавікоў у БССР у другой палове 1930-х гг. сталі вядомымі імёны такіх лепшых стаханавак, як С.

Быкоўская, М. Дзяжурная, П. Пярцова, Е. Башкірава і іншыя, пры гэтым некаторыя з іх атрымалі вядомасць і на ўвесь СССР.

Важнай часткай разгортвання стаханаўскага руху стаў працэс вылучэння яго актыўных удзельніц на адказныя пасады, дзе ўладныя структуры надавалі асаблівую ўвагу сельскагаспадарчай вытворчасці, у якой прадстаўніцы жаночага полу складалі абсалютную большасць сярод стаханаўцаў і станавіліся такім чынам галоўным рэзервам папаўнення кіруючых кадраў аграрнага сектару. Неабходнасць актыўнага вылучэння стаханавак сельскай гаспадаркі рэспублікі была вызначана старшынёй СНК БССР М. Галадзедам у снежні 1935 г. на сесіі ЦВК [9, с. 48], а 31 кастрычніка 1936 г. ЦК КП(б)Б выдаў Пастанову аб вылучэнні жанчын-калгасніц на кіруючую працу, у якой была пастаўлена задача на працягу 1–2 гадоў дабіцца таго, каб значную частку старшынь калгасаў, калгасных брыгадзіраў, загадчыкаў калгасна-таварных ферм складалі жанчыны. Асноўнымі прэтэндэнтамі на заняцце пералічаных пасад партыйным кіраўніцтвам рэспублікі былі вызначаны, для прыкладу, трактарысткі, якія давалі выпрацоўку на трактарах да 1 тысячы га, а таксама льнаводкі і льнотрапальшчыцы, што дабіваліся ўраджаю льну каля 10 ц з гектара [4, с. 221].

У адпаведнасці з вызначанай палітыкай у 1936 г. на сходах і пленумах сельскіх Саветаў Полацкага раёна на адказную калгасную работу (загадчыцамі ферм, брыгадзірамі і на іншыя пасады кіруючага звяна) было вылучана 27 жанчын з ліку лепшых стаханавак, па мясамалочных саўгасах БССР у тым жа годзе на кіруючую гаспадарчую, прафсаюзную і грамадскую працу было вылучана каля 100 лепшых стаханавак [3, арк. 87; 7, арк. 19]. Некаторыя ўдзельніцы стаханаўскага руху з цягам часу ўзначалілі асобныя гаспадаркі. Так, напрыклад, лепшая стаханаўка Кіраўскага раёна А. Вінаградава ў 1939 г. была вылучана на пост старшыні калгаса імя Кірава [8, арк. 181].

Такім чынам, працэс «фемінізацыі» грамадскай вытворчасці быў адзначаны ўдзелам жанчын у стаханаўскім руху ў другой палове 1930-х гг., калі яны станавіліся перадавікамі, удасканальвалі метады сваёй працы і засвойвалі, у выніку, мадэлі працоўных паводзін, характэрныя для мужчын. Большасць

стаханавак была сканцэнтравана ў сельскай гаспадарцы, дзе пераважалі працэсы з выкарыстаннем ручной працы, на якіх сялянкі ў асноўным і мелі магчымасць стаць удзельніцамі руху. Стаханаўскі рух меў важныя сацыяльныя наступствы для жанчын, што прынялі ў ім удзел: яны сталі прадстаўнікамі працоўнай эліты рэспублікі і атрымалі шырокія магчымасці набываць сацыяльныя ролі герояў вытворчасці, што раней у большасці сваёй звязваліся з гендэрным статусам мужчын. Сацыяльная мабільнасць стаханавак акрамя гэта праяўлялася ў іх прасоўванні ўверх па службовай лесвіцы і атрыманні гаспадарча-адміністрацыйных пасад.

ЛІТАРАТУРА

1. **Аб узнагароджанні** граматамі і падарункамі лепшых калгасніц-ільнотрапальшчыц : Пастанова ЦВК і СНК БССР // Звязда. – 1935. – 20 снеж. – С. 1.

2. **Всесоюзная** перепись населения 1937 года : общие итоги : сб. док. и материалов. – М. : Рос. полит. энцикл., 2007. – 320 с.

3. **Дзяржаўны** занальны архіў у г. Полацку. – Ф. 104. Воп. 1. Спр. 93. Постановления, циркуляры Президиума ЦИК БССР, постановления Дриссенского и Освейского РК КП(б)Б, доклады оргмассовой работы Сельских Советов, о результатах обсуждения Конституции (7 декабря 1935 г. – 10 декабря 1936 г.).

4. **КП Белоруссии.** Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК / Ин-т истории партии при ЦК КПБ. – Минск : Беларусь, 1983–1987. – Т. 3 : 1933–1945 / под ред. Г. Г. Барташевича [и др.]. – 1985. – 551 с.

5. **Кудзінаў, С.** Стаханаўскі рух у мясамалочных саўгасах БССР / С. Кудзінаў // Сацыялістычнае будаўніцтва. – 1936 – № 1/2. – С. 107–110.

6. **М. Дзяжурная** рашыла перагнаць П. Пярцову // Звязда. – 1935. – 3 снеж. – С. 4.

7. **Нацыянальны** архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 297. Воп. 1. Спр. 58. Переписка ЦП Союза мясомолочных совхозов БССР о ходе социалистического соревнования и копии договоров о социалистическом соревновании коллективов рабочих совхозов (17 февраля 1936 г. – 20 августа 1936 г.).

8. **НАРБ.** – Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 14253. Справки заведующего сельскохозяйственным отделом, инструктора ЦК КП(б)Б о состоянии пограничных колхозов и о состоянии партийно-массовой работы в колхозах отдельных райнов БССР.

9. **Народна-гаспадарчы** план 1936 стаханаўскага года // Сацыялістычнае будаўніцтва. – 1936. − № 1/2. – С. 15–85.

10. **Чэтверыкоў, В. Н.** Як стаханаўцы-калгаснікі Чаўскага раёна атрымалі тону льновалакна з гектара / В. Н. Чэтверыкоў. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1937. – 88 с.